8. *Петрашень И.А.* Актуализация культурного наследия через призму идеологической зрелости // Высшая школа: проблемы и перспективы: материалы 6-й Междунар. науч.-метод. конф., Минск, 23-24 ноября 2004 г. – Мн.: РИВШ БГУ, 2004. – С.94–95.

9. *Рощупкин А.Ф.* Специфика организации идеологической и воспитательной работы в музыкальном вузе // Высшая школа: проблемы и перспективы: материалы 6-й Междунар. науч.-метод. конф., Минск, 23-24 ноября 2004 г. – Мн.: РИВШ БГУ, 2004. – С.103–105.

10. *Яскевич Я.С.* Основы идеологии белорусского государства: мировозренческие ценности и стратегические приоритеты: учеб.-метод. пособие для высших учебных заведений. – Мн.: РИВШ БГУ, 2003.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**М.Л.Кузьмініч**, *прафесар*

## АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ АСНОВЫ ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ СА СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДДЗЮ

Мэтай працэсу фарміравання асобы спецыяліста ў ВНУ з'яўляецца культурна-асобасны, прафесійны склад чалавека. Цэласная асоба выпускніка разглядаецца як вынік яго агульнай і прафесійнай падрыхтоўкі.

Агульнае ў развіцці характарызуецца ўсебаковасцю і гарманічнасцю развіцця псіхалагічнай структуры асобы, узроўнем яе цэласнасці. Яно праяўляецца ў агульнай культуры асобы і сведчыць аб ступені развіцця і рэалізацыі сутнасных сіл чалавека, яго здольнасцей і дараванняў. Прафесійнае з'яўляецца адным з этапаў у развіцці асобы і характарызуецца імкненнем і падрыхтаванасцю да працы ў сферы культуры, прафесійнымі ведамі, уменнямі і навыкамі, прафесійнай культурай і этыкай. Такім чынам, прафесійнае развіццё асобы базіруецца на

агульным развіцці і ўяўляе сабой дастасаванне духоўных, фізічных і інтэлектуальных сіл асобы да вырашэння прафесійных праблем. Агульнае і прафесійнае ў развіцці асобы ўзаемадапаўняюць і ўзбагачаюць адно аднаго. Іх гарманічнае спалучэнне з'яўляецца ўмовай фарміравання цэласнай асобы спецыяліста. Але гэта магчыма толькі пры арганізацыі такога педагагічнага працэсу, які можа разглядацца як сукупнасць трох узаемазвязаных і ўзаемазалежных падсістэм: тэхналагічнай, сацыяльна-псіхалагічнай, культурна-асобаснай.

Падсістэмы цэласнага працэсу фарміравання асобы спецыяліста ўзаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены. З аднаго боку, іх агульным падмуркам з'яўляюцца фарміраванне чалавечай асобы, падрыхтоўка яе да прафесійнай дзейнасці. З другога боку, педагагічная эфектыўнасць кожнай з падсістэм залежыць ад узаемапераходаў тэхналагічных працэсаў у сацыяльна-псіхалагічныя, а сацыяльна-псіхалагічных – у культурна-асобасныя. Тэхналогія вучэбна-выхаваўчага працэсу павінна быць падпарадкавана вывучэнню сацыяльна-псіхалагічных фактараў развіцця ўдзельнікаў выхаваўчага працэсу, тых рэальных формаў узаемаадносін, якія фарміруюцца і дзейнічаюць у ВНУ. Эфектыўнасць педагагічных уздзеянняў залежыць ад таго, у якой ступені сістэма адносін праяўляецца ў духоўна-маральным і прафесійным складзе асобы будучых спецыялістаў, наколькі мэта і вынік выхаваўчага працэсу адпавядаюць адно аднаму.

У апошні час ва універсітэце склалася і функцыянуе разгалінаваная структура выхаваўчай дзейнасці. Усю работу па фарміраванні асобы будучага спецыяліста накіроўвае прарэктар па мастацкай творчасці і выхаваўчай рабоце. Пры прарэктары створана каардынацыйная рада па справах студэнцкай моладзі і выхаваўчай рабоце, на якой разглядаюцца пытанні арганізацыі работы, плануюцца шляхі ўдасканалення выхаваўчай дзейнасці ўсіх яе суб'ектаў. Мастацкі савет курыруе пытанні эстэтычнага выхавання студэнтаў, арганізацыі іх мастацка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творчай дзейнасці, садзейнічае ўдзелу ў сацыякультурным асяроддзі краіны, горада, раёна, універсітэта, замежжа. Практычную дзейнасць па каардынацыі і арганізацыі выхаваўчага працэсу ва універсітэце ажыццяўляюць аддзел выхаваўчай работы з моладдзю і яго структурныя падраздзяленні – студэнцкі і спартыўны клубы.

Асноўнымі мэтамі студэнцкага клуба з'яўляюцца арганізацыя адпачынку і забеспячэнне духоўна-культурнага развіцця студэнтаў, выяўленне і падтрымка таленавітай моладзі. Прапаганда фізічнай культуры і здаровага ладу жыцця, фарміраванне ў студэнцкай моладзі адносін да свайго здароўя як сацыяльнай каштоўнасці, арганізацыя спартыўна-масавай работы сярод студэнтаў – галоўная мэта дзейнасці спартыўнага клуба. Музей і бібліятэка універсітэта ствараюць неабходныя ўмовы для правядзення выхаваўчых мерапрыемстваў, арганізуюць сістэматычную работу па ідэалагічным, нацыянальна-патрыятычным, маральным і эстэтычным выхаванні студэнцкай моладзі.

Намеснікі дэканаў факультэтаў па выхаваўчай рабоце накіроўваюць і каардынуюць работу кафедраў, куратараў акадэмічных груп, студэнцкіх грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў у адпаведнасці з мэтамі і задачамі вучэбна-выхаваўчага працэсу.

Важным суб'ектам выхаваўчай дзейнасці універсітэта з'яўляецца куратар акадэмічнай групы, які праводзіць сваю работу з улікам узроставых асаблівасцей, інтарэсаў, прыхільнасцей і каштоўнасных арыентацый студэнтаў, магчымасцей навучальнай установы. Асноўнымі прынцыпамі дзейнасці куратара акадэмічнай групы з'яўляюцца індывідуальны падыход да кожнага студэнта, узаемадзеянне са студэнцкім актывам, уключанасць у справы і праблемы групы, імкненне павысіць эфектыўнасць выхаваўчай дзейнасці.

Станаўленне і развіццё студэнцкага калектыву немагчыма ўявіць без пераўтварэння яго ў самакіруючы сацыяльны арганізм. Дзейнасць органаў самакіравання ва універсітэце праду-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гледжвае стварэнне ўмоў для найбольш поўнага раскрыцця творчага патэнцыялу студэнцкай моладзі, фарміравання прафесійнай культуры будучага спецыяліста, грамадзянскай пазіцыі і патрыятычнага выхавання, развіцця традыцый універсітэта. Выхаванне сацыяльнай актыўнасці ў студэнтаў патрабуе іх рэальнага ўдзелу ў кіраванні працэсам навучання ў ВНУ.

Важнейшым кірункам дзейнасці універсітэта з'яўляецца грамадзянскае выхаванне студэнцкай моладзі. Фарміраванне палітычнай культуры студэнтаў, навуковага светапогляду, грамадскай пазіцыі, патрыятызму, умення з навуковых пазіцый ацэньваць падзеі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і знешнепалітычныя працэсы сёння вылучаецца на адно з вядучых месцаў у рабоце са студэнцкай моладдзю.

Працоўнае і прафесійнае выхаванне студэнтаў накіравана на фарміраванне працоўных і прафесійных навыкаў, творчых адносін да працы, працавітасці, адказнасці, сумленнасці, здольнасці да прафесіянальнага самаўдасканалення, развіцця прыстойных паводзін, прыродаахоўнай актыўнасці.

Маральна-эстэтычнае выхаванне студэнтаў прадугледжвае фарміраванне ўяўленняў і паняццяў аб маральных асновах жыцця, развіццё ў студэнцкай моладзі эстэтычных ідэалаў і інтарэсаў, здольнасці мастацка-творчага самавыяўлення.

Фізкультурна-аздараўленчая работа і прапаганда здаровага ладу жыцця накіраваны на выхаванне беражлівых адносін да свайго здароўя і здароўя акружаючых як да каштоўнасці, на фарміраванне ўменняў і навыкаў бяспечных і адказных паводзін, фізічнай і разумовай актыўнасці.

Комплексны падыход да выхавання асобы азначае адзінства ўсіх напрамкаў выхаваўчай работы, каардынацыю разнастайных яе формаў і метадаў. Усе дзеянні арганізатараў працэсу скіраваны на агульнае і прафесійнае развіццё студэнта, на падрыхтоўку яго да жыцця ў якасці грамадзяніна, прафесіянала, сем'яніна, фізічна здаровай асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У працэсе фарміравання асобы спецыяліста вылучаюцца тры асноўныя перыяды – дауніверсітэцкі, універсітэцкі і пасляуніверсітэцкі, на кожным з якіх вырашаюцца спецыфічныя выхаваўчыя задачы. Адпаведна праграма выхаваўчай работы універсітэта ўключае наступныя раздзелы:

1) работа па прафесійнай арыентацыі сярод выпускнікоў сярэдніх школ, ліцэяў, каледжаў, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў;

2) выхаваўчая работа са студэнтамі ў час іх навучання;

3) работа з выпускнікамі універсітэта.

Прафарыентацыйная работа ва універсітэце звязана з распаўсюджваннем звестак аб яго спецыяльнасцях і спецыялізацыях, фарміраваннем у моладзі цікавасці да дзейнасці ў сферы культуры і мастацкай творчасці. У час універсітэцкай падрыхтоўкі студэнт праходзіць некалькі этапаў свайго станаўлення, на кожным з якіх адбываецца прафесійнае развіццё будучага спецыяліста. Работа з выпускнікамі універсітэта – важная частка дзейнасці ВНУ. Яна звязана з дапамогай маладому спецыялісту ў хутчэйшай адаптацыі да працоўнай дзейнасці, пераадоленні ўзніклых перад ім цяжкасцей.

Этапы станаўлення студэнта ў ВНУ наступныя:

– адаптацыі да ўмоў навучання ва універсітэце (першы курс);

– фарміравання базісу будучай прафесійнай дзейнасці, асобаснага самавыяўлення (другі–трэці курсы);

– вузкапрофільнай падрыхтоўкі да прафесійнай дзейнасці і вызначэння будучага месца працы ці сферы навукова-педагагічнай дзейнасці (чацвёрты–пяты курсы)

На кожным з этапаў агульнага і прафесійнага развіцця асобы студэнта рэалізуецца цэласная праграма выхавання студэнцкай моладзі, якая ахоплівае:

а) асноўныя сферы жыццядзейнасці студэнтаў:

– вучэбную,

– бытавую,

– грамадскую,

– вольнага часу;

б) асноўныя напрамкі выхаваўчай дзейнасці:

– грамадзянскае выхаванне,

– працоўнае і прафесійнае выхаванне,

– маральна-эстэтычнае выхаванне

– фізкультурна-аздараўленчая работа і прапаганда здаровага ладу жыцця,

в) працэсы самавыхавання, самаадукацыі, самаразвіцця асобы студэнта.

Работа з выпускнікамі універсітэта звязана з дапамогай маладому спецыялісту ў хутчэйшай адаптацыі да працоўнай дзейнасці, пераадоленні ўзніклых перад ім цяжкасцей. Для вырашэння гэтых задач планам выхаваўчай работы прадугледжваюцца:

– арганізацыя кансультацый з боку выпускаючых кафедраў для выпускнікоў;

– забеспячэнне іх метадычнай літаратурай, рэпертуарам, сцэнарыямі і інш.

– правядзенне сустрэч з выпускнікамі;

– далучэнне выпускнікоў да навукова-педагагічнай дзейнасці: падрыхтоўка да паступлення ў магістратуру і аспірантуру, удзел у навукова-практычных канферэнцыях, круглых сталах і інш.

– запрашэнне выпускнікоў да ўдзелу ва універсітэцкіх святах і традыцыйных мерапрыемствах;

– афармленне стэнда “Выпускнікі універсітэта” ў музеі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў;

– прагляд творчых дасягненняў выпускнікоў універсітэта (удзел творчых калектываў, якімі кіруюць выпускнікі, у мерапрыемствах універсітэта) і інш.

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў будуе сваю дзейнасць у адпаведнасці з класічнымі традыцыямі універсітэцкай адукацыі на аснове прынцыпаў адзінства

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адукацыі, навуковай і творчай дзейнасці, сувязі навукова-педагагічнага працэсу з практыкай. Універсітэт мае статус вядучай вышэйшай навучальнай установы ў сістэме нацыянальнай адукацыі ў галіне культуры і шмат у чым вызначае месца і ролю профільнага універсітэта ў сацыяльна-культурнай сферы беларускага грамадства. Сярод асноўных мэт яго дзейнасці – задавальненне патрэбнасцей асобы ў атрыманні вышэйшай адукацыі і кваліфікацыі, у яе інтэлектуальным, маральным, культурным і фізічным развіцці на аснове адзінства навучальнага працэсу, навуковых даследаванняў і мастацка-творчай дзейнасці; культурна-адпачынкавае абслугоўванне насельніцтва, шырокая канцэртная дзейнасць з мэтай эстэтычнага выхавання моладзі і дарослых, прапаганда дасягненняў нацыянальнай культуры, здабыткаў нацыянальнага мастацтва і інш.

Інтэнсіўная мастацка-творчая дзейнасць і культурна-адпачынкавае абслугоўванне насельніцтва з'яўляюцца важнейшымі кірункамі дзейнасці універсітэта, якія забяспечваюць комплексную рэалізацыю ўсіх яго асноўных функцый – навучальнай, даследчай, прафесійнай, гуманітарнай і сервіснай. БДУ культуры і мастацтваў – своеасаблівы сацыяльна-культурны інстытут беларускага грамадства, які ажыццяўляе духоўную вытворчасць, забяспечвае трансляцыю ведаў і традыцыйных элементаў культуры, рэгулюе развіццё культуры, займаецца арганізацыяй, планаваннем культурнага працэсу і яго кіраваннем.

Як сацыяльна-культурны інстытут грамадства універсітэт у працэсе мастацка-творчай, культурна-шэфскай, дабрачыннай дзейнасці рэалізуе адпаведныя функцыі: рэгулятыўную (забяспечвае рэгуляванне ўзаемаадносін паміж членамі грамадства шляхам выпрацоўкі нормаў паводзін); інтэгратыўную (распаўсюджвае сукупнасць поглядаў, перакананняў, каштоўнасцей, ідэалаў, характэрных для беларускай культуры, захаванне культурнай спадчыны, нацыянальных традыцый, гістарычнай памяці, што садзейнічае ўстанаўленню сувязей паміж пакаленнямі, згуртаванню нацыі); трансляцыі культурнага вопыту ад

аднаго пакалення да другога, ад аднаго народа да другога; захавання, перадачы і развіцця элементаў сацыяльнай і культурнай спадчыны; камунікатыўную (забяспечвае трансляцыю сацыяльна важнай інфармацыі, інтэграцыю грамадства і сацыяльных груп, унутраную і знешнюю дыферэнцыяцыю соцыуму і груп); культурна-адпачынкавую, скіраваную на рэалізацыю творчага і духоўнага патэнцыялу асобы; рэкрэацыйную і кампенсатарную, скіраваную на аднаўленне сіл, аздараўленне праз арганізацыю адпаведных забаўляльных, гульнёвых, аздараўленчых, мастацка-творчых праграм; сацыялізацыі асобы праз стварэнне разнастайных умоў, якія забяспечваюць перавод рэальна існуючых у грамадстве адносін у пэўныя якасці асобы. Пералічаныя функцыі адпавядаюць мэтам дзейнасці універсітэта культуры і мастацтваў і скіраваны на забеспячэнне сумеснай дзейнасці людзей, якія імкнуцца да задавальнення культурных патрэбнасцей .

Універсітэт культуры і мастацтваў актыўна ўзаемадзейнічае з сацыяльным асяроддзем, аператыўна рэагуе на тыя працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве, імкнецца ва ўсіх відах сваёй дзейнасці адпавядаць патрэбнасцям розных суб'ектаў соцыуму, забяспечваць і абараняць інтарэсы чалавека як актыўнага суб'екта культурнай дзейнасці. У працэсе арганізацыі і правядзення культурна-адпачынкавых мерапрыемстваў акцэнт рабіцца на стварэнне ўмоў, неабходных для развіцця ініцыятывы, актыўнай творчасці ўсіх удзельнікаў. Гэта адпавядае суб'ект-суб'ектнай тэарэтычнай мадэлі арганізацыі вольнага часу людзей, калі кожны чалавек выступае ў якасці суб'екта арганізацыі ўласнага адпачынку. Новая сацыякультурная сітуацыя ў грамадстве, працэсы дэмакратызацыі і гуманізацыі, дынаміка культурных патрэбнасцей і інтарэсаў чалавека рэалізуюцца ў прынцыпах сацыяльна-культурнай дзейнасці студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта: гуманізацыі, свабоды творчай дзейнасці, самаразвіцця культурных працэсаў, плюралізму стыляў і кірункаў у творчасці, усеагульнасці культуратворчасці, самаар-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

ганізацыі, самасцвярджэнні асобы, дыялектычнага адзінства і пераемнасці культурна-гістарычнага, нацыянальна-этнічнага вопыту, традыцый і інавацый, спалучэння дзяржаўных і грамадскіх пачаткаў у арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Такім чынам, аснову арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці БДУ культуры і мастацтваў складаюць захаванне, трансляцыя, засваенне і развіццё традыцый, каштоўнасцей, нормаў у сферы мастацтва і духоўна-маральнай культуры.

Сацыякультурная дзейнасць студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта ажыццяўляецца ў пазааўдыторны час і адпавядае межам вольнага часу іншых удзельнікаў культурна-адпачынкавых мерапрыемстваў. Пры гэтым у адносінах да студэнтаў пазааўдыторны час толькі з пэўнай доляй умоўнасці можна назваць таксама вольным. Па сутнасці ўдзел у правядзенні культурна-адпачынкавых мерапрыемстваў з'яўляецца працягам вучэбнага працэсу: ідзе работа па ўдасканаленні і набыцці новых прафесійных уменняў і навыкаў, рэалізацыі створаных у навучальным працэсе праграм і праектаў, апрабацыі і асваенні культурна-адпачынкавых тэхналогій, методык сацыяльна-культурнай дзейнасці. Гэтая дзейнасць уяўляе дынамічны працэс і таму патрабуе творчага падыходу да вырашэння задач арганізацыі культурнага адпачынку розных сацыяльных груп насельніцтва. Найлепшыя вынікі сацыяльна-культурнай дзейнасці дасягаюцца ў тых выпадках, калі сродкі культурна-творчага працэсу выкарыстоўваюцца комплексна, калі яны ўзаемадзейнічаюць паміж сабой і ўсе разам скіраваны на асобу – на актывізацыю яе творчых сіл, стварэнне ўмоў для духоўнага ўзвышэння, адпачынку.

Такім чынам, актыўны ўдзел студэнтаў у сацыяльна-культурнай дзейнасці універсітэта забяспечвае іх эфектыўны прафесійны рост, а выхаваўчая накіраванасць мерапрыемстваў садзейнічае фарміраванню ў іх актыўнай жыццёвай пазіцыі, высокай агульнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Кузьмініч М.Л., Сергіевіч В.І.* Сістэма выхаваўчай работы ва універсітэце: дапаможнік для арганізатараў выхаваўчай работы і студэнцкага актыву. – Мн.: Бел. ун-т культуры, 1998. – 81 с.

2. *Кузьмініч М.Л.* Праграма маніторынгу ідэалагічнага суправаджэння выхаваўчай работы са студэнтамі. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2004. – 11 с.

3. *Кузьмініч М.Л.* Комплексная мэтавая праграма выхавання студэнцкай моладзі: дапаможнік для арганізатараў выхаваўчага працэсу ў ВНУ. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2004. – 24 с.

**Л.К.Кухто**, *ст.преподаватель*

## ИНТЕРПРЕТАЦИЯ ИДЕОЛОГИИ КАРЛОМ МАНХЕЙМОМ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

История идеологии показывает неоднозначное к ней отношение – от объявления ее надуманным, искусственным и даже вредным духовным образованием, от которого следует избавиться, до признания ее как необходимого элемента консолидации общества. Для постижения студентами сущности идеологии важное значение имеет концепция К.Манхейма, которая оказала большое влияние на формирование современных подходов к пониманию идеологии.

Карл Манхейм был знатоком современных ему философских и социологических идей, многие из которых использовал в своем творчестве. Он специально занимался анализом религиозного (христианского в целом, анабаптистского в особенности) сознания, активно разрабатывал проблемы культуры и образования. Концепция Манхейма может быть определена как культурологическая методология с предельно широкой